Попел Чарнобыля

26 красавіка 1986 года... Гэты дзень назаўсёды ўвойдзе ў гісторыю чалавецтва той страшнай памяццю, якая будзе кожны раз прымушаць уздрыгваць пры ўспамінах. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС горкай трагедыяй увайшла ў жыццё і сэрцы жыхароў Хойніцкага раёна, маіх родных і блізкіх, знаёмых і сяброў, таварышаў па працы, многіх мільёнаў людзей. Чорным крылом апусцілася бяда, раздзяліўшы наша жыццё на два перыяды: дачарнобыльскі і паслячарнобыльскі.

Буйнейшая тэхнагенная катастрофа XX стагоддзя крута змяніла нашы лёсы, уклад жыцця, унесла карэктывы ў далейшае развіццё Хойніцкага раёна, ды і рэспублікі ў цэлым. Яна аказала ўплыў і на жыццё нашых суседзяў — народаў Расіі і Украіны, якія таксама пацярпелі ад вынікаў Чарнобыля.

З-за трагедыі на ЧАЭС з нашага раёна было эвакуіравана і адселена толькі ў першыя месяцы каля 20 тысяч чалавек, амаль у палавіне населеных пунктаў перастаў гучаць дзіцячы смех. Не стала 6 сельскіх Саветаў, ліквідаваны 7 калгасаў і саўгасаў, закрыты 10 агульнаадукацыйных школ, 20 устаноў медыцыны і культуры, выведзены з карыстання 88 тысяч гектараў зямель. Гэта для маіх землякоў памяць Чарнобыля, яго жорсткая спадчына!

У той час я працаваў загадчыкам арганізацыйнага аддзела Хойніцкага райкама КПБ, з'яўляўся членам бюро райкама. Мне давялося быць непасрэдным удзельнікам і сведкам тых падзей, займацца эвакуацыяй насельніцтва з так званай 30-кіламетровай зоны, рашэннем іншых неадкладных задач, выкліканых катастрофай на Чарнобыльскай АЭС.

Разам са мной ліквідацыяй вынікаў катастрофы ў першыя яе дні і тыдні займаліся калегі па працы, работнікі райкама партыі і райвыканкама, кіраўнікі гаспадарак, галоўныя спецыялісты і кадры сярэдняга звяна. Менавіта яны былі прамымі арганізатарамі і выканаўцамі мерапрыемстваў, якія вызначаліся рэспубліканскім і абласным штабамі па ліквідацыі вынікаў трагедыі на атамнай станцыі. Менавіта яны знаходзіліся на пярэднім краі цяжкай, знясільваючай працы, рызыкавалі сваім здароўем, не думаючы пра вынікі шматгадзіннага знаходжання ў зоне пад уздзеяннем радыяцыі. А месцамі ўзроўні выпраменьвання даходзілі там да 600 мілірэнтген і больш. Ніхто з іх не думаў тады аб узнагародах, льготах, нейкай выгодзе. Так трэба было! Такімі нас выхаваў час, у якім мы жылі.

З асаблівай цеплынёй праз гады я ўспамінаю тых, хто ў красавіцкія — чэрвеньскія дні 1986 года разам са мной не ў кабінетах, а на месцах вырашаў пытанні, якімі да гэтага часу не займаўся ніхто. Гэта Аляксандр Дзяйкун, Віктар Васькевіч, Мікалай Вашчанка, Алег Яўстратаў, Сяргей Жыляк, Іван Васюк, Пётр Краўчанка, Арсен Сакун, Анатоль Ткачэнка, Георгій Хліманкоў, Аляксандр Каюда, Вячаслаў Курэнь, Мікалай Сацура, Іосіф Азаркевіч, Іосіф Грыгаровіч, Міхаіл Малец, Штр Лекаркін, Іван Цішкевіч, Мікалай Бельчанка, Анатоль Шара-па, Аляксандр Краўчанка... Гэты пералік можна працягваць і далей. Няхай не будуць на мяне ў крыўдзе тыя, каго не назваў. Лепшая падзяка ім за іх подзвіг — памяць жыхароў Хойніцкай зямлі.

Ляцяць гады. Ім уласціва сціраць з памяці самае радаснае, самае сумнае і самае значнае. Праз гады мы і самі часам глядзім на падзеі, удзельнікамі якіх былі, некалькі інакш — так пабудавана жыццё.

Усё гэта і змусіла мяне ўзяцца за пяро, каб пакінуць успаміны і ўражанні аб першых днях жыцця пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, аб тым, якія выпрабаванні выпалі, што перажыта. Гэта маё асабістае: і погляд на падзеі тых далёкіх дзён, і іх ацэнка, дзе давялося быіь у тыя дні, чым займаццэ. Дык вось...

26 красавіка дзень выдаўся ясны, сонечны. Напярэдадні, у пятніцу, я з сям'ёй прыехаў да бацькоў у пасёлак імя Леніна. Збіраліся ў выхадныя пасадзіць бульбу. Раніцою ў суботу хутка развезлі і раскідалі на агародзе гной і прыступілі да пасадкі.

Нішто не гаварыла пра бяду, праца спорылася. З паўднёвага ўсходу дзьмуў

цёплы вецер. Дзеці, шасцігадовы сын Ігар і дачка Лена (ёй у той дзень споўнілася 4 гады), гулялі на вуліцы.

Недзе к дзесяці гадзінам з боку Хойнік над намі ў напрзмку вёскі Пагоннае (а гэта якраз у бок Чарнобыля) сталі пралятаць вялікія ваенныя верталёты. Ляцела многа. Мы моўчкі праводзілі іх вачамі. Бацька, праўда, выказаў меркаванне, што, мусіць, ідуць вучэнні. Я не згадзіўся, бо ніякага паведамлення ў прэсе аб вучэннях на тэрыторыі Беларускай ваеннай акругі не было. А верталёты ўсё ляцелі.

У канцы дня мы вырашылі з'ездзіць да жончыных бацькоў у вёску Лясок, якая знаходзілася за паўтара кіламетра ад Пагоннага. Выйшлі на шашу, сталі чакаць маршрутнага аўтобуса, Пачаў накрапваць дожджык, па-ранейшаму дзьмуў цёплы вецер. З боку Бабчына паказалася аўтамашына. Спыніўся знаёмы вадзіцель, і жонка вырашыла ехаць з дзецьмі ў Хойнікі. Я застаўся адзіы.

Праз некаторы час паказаўся зноў аўтамабіль. Гэта быў малакавоз, які дастаўляў малако з калгаса «Новае жыццё», што знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці ад Чарнобыля. Прагаласаваў. Вадзіцель, малады мужчына гадоў трыццаці, расказаў, што ў тым баку (ён меў на ўвазе Прыпяцкую зону) адбываецца нешта незразумелае, з-за ракі ў ыашы вёскі Уласы, Радзін, Баршчоўка пераязджаюць людзі, у асноўным жанчыны і дзеці. І ўсе гавораць аб нейкім выбуху на атамнай станцыі.

За размоваю не заўважылі, як прыехалі ў Хойнікі. Такім чынам, ад вадзіцеля малакавоза я і пачуў упершыню пра выбух на Чарнобыльскай АЭС. Ужо дома расказаў жонцы аб гэтым. Мы зачынілі фортачкі ў кватэры, паклікалі дзяцей з вуліны. Я пазваніў у прыёмную райкама партыі. Дзяжурны паведаміў, што члены бюро запрашаюцца на 18 гадзін да першага сакратара райкама КПБ. 26 красавіка 1986 года ў 18 гадзін першы сакратар райкама партыі паведаміў членам бюро пра тое, што на Чарнобыльскай атамнай станцыі адбылася нейкая аварыя, падрабязнасцей аб якой пакуль ніякіх няма. Ён папрасіў усіх весці сябе адпаведна і дзейнічаць так, каб не было панікі, працягваць комплекс веснавых палявых работ, рыхтавацца да першамайскай дэманстрацыі. Так пачалося наша жыццё пад Чарнобылем.

У наступныя дні асаблівага напружання ў рабоце райкама партыі, райвыканкама не адчувалася, усё было, як звычайна: ішла вясенняя пасяўная кампанія, жыхары раёна працавалі на сваіх прысядзібных участках, рыхтаваліся да 1 Мая і Дня Перамогі. Адно, што адрознівала жыцпс раёна, — гэта прыезды розных камісій і дэлегацый вучоных з Мінска, Масквы, Ленінграда, іншых месц. Усе яны імкнуліся пабываць у населеных пунктах, размешчаных бліжэй да Украіны.

У адзін з красавіцкіх дзён мяне запрасілі ў кабінет да першага сакратара. Ён прапанаваў выехаць з групай вучоных у вёску Пагоннае і суправаджаць іх да мяжы Брагінскага раёна. У кабінеце першага сядзелі тры сівавалосыя, прадстаўнічага выгляду мужчыны. Ці працставіліся, хто і адкуль яны былі, цяпер не памятаю. Удакладніўшы асобныя моманты даручэння, стаў збірацца ў паездку.

Райкамаўскі ўазік праз гадзіну з невялікім даставіў нас у вёску Дронькі.

На вуліцы мы нікога не сустрэлі, бо людзі былі на працы, многія шчыравалі на сваіх агародах. Адразу за гэтай вёскай каля дарогі на Пагоннае ўбачылі статак кароў, жыхары адбывалі радоўку. Госці папрасілі мяне спыніцца. Выйшлі з машыны і накіраваліся да пастуха. Яны пыталіся ў яго, ці ведаюць у вёсцы, што здарылася ў Чарнобылі. Атрымаўшы на гэта станоўчы адказ, вучоныя заявілі, што нічога асаблівага не адбылося на станцыі, звычайная непаладка. Таму трэба пасвіць жывёлу, засяваць агароды, але пры гэтым менш бываць на сонцы. Пагутарыўшы яшчэ крыху пра вясковае жыццё, мы паехалі далей.

Усе гады пасля той паездкі я часта ўспамінаю туго размову і не знаходжу для сябе адказу на адно пытанне: або вучоныя сапраўды не ведалі стану спраў на станцыі і як паводзіць сябе ў падобнай сітуацыі, або яны ўжо тады выкон-валі пэўны заказ? І ў першым, і ў другім выпадку, думаю, няхай Бог ім будзе суддзёй.

У Пагонным у канторы саўгаса «Перамога сацыялізму» нас чакаў яго дырэктар Пётр Краўчанка. Ён расказаў пра стан спраў у гаспадарцы, як ідуць палявыя работы. На яго пытанне, што рабіць у сувязі з абстаноўкай на станцыі, пачуў параду, што

трэба працаваць у ранейшым рэжыме, бо прычын для іншых дзеян-няў ніякіх няма.

Далей наш шлях ляжаў у калгас «Новае жыццё». Кіраўнік гэтай гаспадаркі Іван Васюк, мой зямляк, таксама праінфармаваў аб клопатах вяскоўцаў. Іван Мікалаевіч паведаміў і пра тое, што ў вёскі, якія ўваходзяць у калгас, усё больш пераязджае людзей з украінскіх вёсак, размешчаных каля станцыі (тэрыторыя калгаса межавала з Украінскай ССР, непасрэдна прылягала да чарнобыльскіх земляў). На сваё пытанне, як дзейнічаць у той сітуацыі, што склалася, Васюк пачуў амаль такі ж адказ, як і яго суседкіраўнік.

Праз некаторы час маскоўскія госці падаліся на тэрыторыю Брагінскага раёна, а я, развітаўшыся з Іванам Мікалаевічам, вярнуўся ў Хойнікі.

1 мая ў горадзе прайшла першамайская дэманстрацыя. Ішлі ў калонах працоўныя калекгьшы, як гэта было прынята, з лозунгамі, транспарантамі і, безумоўна ж, з партрэтамі правадыроў. Члены бюро райкама партыі, у тым ліку і я, члены выканкама стаялі на трыбуне каля помніка Леніну і віталі дэманстрантаў, а тыя ў калоне — нас. З бацькамі ішлі і дзеці. Праўда, было прынята рашэнне, каб вучні школ і навучэнцы вучылішча горада ў першамайскай дэманстрацыі не ўдзельнічалі.

Народ святкаваў Першамай, не ведаючы пра тое, што ўся Хойнікаўшчына і іншыя тэрыторыі засыпаны радыеактыўнымі элементамі, што праз некалькі дзён у нашым жыцці адбудуцца падзеі, вынікі якіх расцягнуцца на вякі.

Да таго часу з населеных пунктаў Аравіцкага і Радзінскага сельскіх саветаў былі вывезены дзеці і цяжарныя жанчыны. Іх размясцілі ў гарадскіх школах і бліжэйшых да Хойнік вёсках.

Увесь гэты час з намі ў раёне заставаліся і нашы дзеці, хаця многія і вывезлі сваіх за межы вобласці і далей. Памятаю, той жа сакратар райкама прахаджваўся ў тыя дні па вуліцах горада са сваёй малой дачушкай, тым самым, як ён лічыў, не даваў падстаў для панікі. Адэкватныя дзеянні патрабаваліся і ад камуністаў, кіруючых кадраў раёна. Усё было скіравана на тое, каб прадухіліць паніку сярод насельніцтва.

2 мая я зноў быў у населеных пунктах Аравіцкага і Радзінскага сельскіх саветаў. Разам са мной знаходзіліся старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК Георгій Хліманкоў і галоўны інжынер РАПА Анатоль Ткачэнка. Мы пабывалі ў вёсках Пзгоннае, Лясок, Радзін, Уласы, Сінцы, Чамкоў, дзе сустракаліся з жыхарамі, імкнуліся іх крыху супакоіць, запэўніваючы, што ніякай небяспекі для пражывання тут няма, патрэбна працягваць веснавыя работы. На іх пытанні, чаму ж вывезлі дзяцей і цяжарных жанчын, я адказваў, што дзеці ўсётакі ёсць дзеці і іх патрэбна аберагаць нават ад малейшага ўплыву таго, што здарылася на станцыі. Людзі верылі, бо многія ведалі, што мая жонка з гэтых мясцін, і тут жа ў вёсцы Лясок жывуць яе бацькі і блізкія родзічы. Ды і сам я верыў у тое, што тады гаварыў, бо іншага адказу проста не ведаў.

А ўзровень радыяцыі быў там унушальны! Да прыкладу, недалёка за Чамковым ёсць горка, з якой адкрываецца від на станцыю. Мы пад'ехалі, падняліся наверх. Надвор'е стаяла сонечнае, яснае. І было відаць, як над кратэрам чацвёртага рэактара адзін за адным завісаюць верталёты, нешта адцзяляецца ад іх і падае ўніз. Гэта сёння, праз многія гады пасля таго дня, мы ведаем, што верталётчыкі цаной свайго жыцця і свайго здароўя тушылі атамны агонь, утаймоўвалі смяротную стыхію.

Затым мы накіраваліся да старшыні калгаса «Новае жыццё» Івана Васюка і расказалі яму пра ўбачанае. Ён паведаміў, што па замерах узровень радыяцыі на гэтай горцы на схілах 400—500 мілірэнтген, а на яе вяршыні — усе 600. Але мы тады пра гэта нічога не ведалі, як і не ведалі пра ўплыў радыеакгыўнага выпраменьвання.

Недзе ў канцы таго дня з кабінета дырэктара саўгаса «Перамога сацыялізму» Пятра Краўчанкі я пазваніў першаму сакратару райкама партыі. Далажыў яму абстаноўку І запытаў, што маёй групе рабіць далей. У адказ пачуў, што да нас выехаў намеснік старшыні райвыканкама Мікалай Вашчанка, з ім многія работнікі райкама і райвыканкама, па прыезде ён раскажа, што рабіць далей.

З групай я выехаў за Пагоннае, па шляху завітаў да жончынага стрыечнага брата Пятра Грамыкі. Яго жонка Зіна

сабрала нам перакусіць. У хуткім часе аўтобусам пад'ехалі Вашчанка, іншыя адказныя работнікі райкама і райвыканкама. Мікалай Аляксандравіч паведаміў. што на высокім узроўні прынята рашэнне эвакуіраваць усіх жыхароў Аравіцкага і Радзінскага сельскіх саветаў, вывезці з гзтай мясцовасці жывёлу прывагнага і грамадскага сектараў, спыніць часова тут усялякую дзейнасць.

Мікалай Аляксандравіч як старшыня эвакуацыйнай камісіі і я размеркавалі работнікаў па населеных пунктах, яшчэ раз растлумачылі, што гаварыць жыхарам: адсяленне ўсяго на некалькі дзён, з сабой узяць толькі дакументы, грошы, крыху прадуктаў харчавання. Пасля чаго ўсе раз'ехаліся па месцах апавяшчэння аб эвакуацыі.

Я выбраў сабе вёску Уласы. Увесь вечар да позняй ночы хадзіў з Анатолем Ткачэнкам па дамах, лапярэджваючы жыхароў пра заўтрашні ад'езд. Было ўсё: пытанні, на якія не знаходзілася адказаў, слёзы і не вельмі прыемныя выказванні, як у наш адрас, так і ў адрас улад Масквы і Мінска. Жыхары Чамшва і Сінцоў, у якіх я быў днём і гаварыў ім аб магчымасці пражывання, пыталіся з недаўменнем: як так, якая эвакуацыя? Дзе Баранаў? Ён жа гаварыў, што тут можна жыць! Пытанні, пытанні...

Глыбокай ноччу з 2 на 3 мая і вярнуўся дадому ў Хойнікі. А ўжо ў 7 гадзін раніцы зноў быў у канторы саўгаса «Перамога сацыялізму», дзе сабраліся члены парткама, галоўныя спецыялісты. Пытанне стаяла адно: эвакуацыя насельніцтва і спыненне ўсёй гаспадарчай дзейнасці. Былі вызначаны меры па зладжаным правядзенні звязаных з гэтым комплексам мерапрыемстваў, прызначаны адказныя асобы. Агульнае кіраўніцтва ўсімі работамі па гэтым саўгасе, як член бюро райкама партыі, я ўзяў на сябе.

Раніцай таго ж дня, прыехаўшы ў Дронькі, мы спыніліся каля разгорнутай паходнай палаткі. З яе выйшаў падпалкоўнік медыцынскай службы. Пагутарыўшы некалькі мінут каля машыны, ён запрасіў мяне ў палатку. Маладзенькая медсястра па яго прапанове наліла ў дзве гранёныя шклянкі грамаў па 120 спірту. На мой недаўменны позірк падпалкоўнік заявіў, што ў гэтай мясцовасці цяпер трэба пакрыху прымаць спіртное і запрасіў выпіць, што мы і зрабілі. Замест закусі прапанаваў цыгарэту, а з-за таго, што я да таго часу ўжо кінуў курыць, давялося закусіць «рукавом». Праз некаторы час, развітаўшыся з ваенным медыкам, мы паехалі далей, у вёску Пагоннае. Па заканчэнні пасяджэння парткама саўгаса «Перамога сацыялізму» заехаў да жончыных родзічаў у вёску Лясок. Цесць, Аляксей Міхайлавіч, добрай душы чалавек, зараз нябожчык, пабачыўшы мяне так рана, неяк перамяніўся ў твары і запытаў, што ім рабіць далей.

Увайшлі ў дом. Маці гатавала сняданак. Завітаў дзядзька Піліп і іншыя суседзі. Усе чакалі, што скажу ім. Я паведаміў аб прынятым рашэнні наконт эвакуацыі, расказаў, як усё гэта будзе адбывацца: жывёлу, якая знаходзіцца ў насельніцтва, закупіць дзяржава, людзі возьмуць з сабой толькі дакументы, грошы, нешта з прадуктаў харчавання. Жыхары Пагоннага і Ляска пераселяцца ў Тульгавічы, там жа будзе знаходзіцца і кантора іх саўгаса. Той, хто жадае, можа ехаць да родзічаў і знаёмых.

Жанчыны, пачуўшы сказанае, — у слёзы, а цесць распарадзіўся накрыць стол, у апошні раз пасядзець з аднавяскоўцамі, выпіць па чарцы-другой: калі Бог дасць яшчэ пабачыцца?

Вёсачка была невялікая, і яе жыхары жылі як адна сям'я. Праз некаторы час у доме Аляксея Міхайлавіча Балянка, майго цесця, сабраліся многія вяскоўцы, кожны нёс з сабой нешта на стол. Разам з імі пасядзеў за сталом і я, пасля чаго вярнуўся ў Пагоннае.

А там поўным ужо ходам ішла эвакуацыя. Жыхары вёскі заявілі, што паедуць толькі пасля таго, як будуць прыняты ад іх каровы і свінні. Жывёлу на вагу вызначалі камісійна, грузілі на аўтамашыны і вывозілі. Адначасова ішла і пагрузка грамадскага пагалоўя. Жанчыны, праводзячы сваіх рагуль, плакалі. Неспакойна паводзіла сябе і жывёла.

4 мая эвакуацыйныя работы працягваліся. На дапамогу прыехала 40 — 50 салдат з двума афіцэрамі.

З раніцы прыбылі для перавозкі людзей аўтобусы. Апоўдні пачалася эвакуацыя насельніцтва. Плакалі жанчыны і дзеці, старыя прасілі пакінуць іх паміраць на

роднай зямлі, мужчыны былі негаваркія. З'явіліся і першыя ў нецвярозым стане.

Я зноў заехаў у Лясок. Там ужо ўсе былі гатовыя да ад'езду. Раптам высветлілася, што няма адной бабулькі. Мы з цесцем, некалькі салдат і старшы лейтэнант пайшлі да яе на падворак. У доме — нікога, пуста і ў хляве. Адзін з салдат злазіў на гарышча. Там таксама было пуста. У двары, на калодзежы, палавіна якога была зачынена, ляжалі каралі. Пашукалі багром — у калодзежы таксама пуста.

У бабулі было некалькі маленькіх сабачак, і ўвесь той час, што мы яе шукалі, яны бегалі па двары. Раптам усе лаімчалі ўбок лесу, які знаходзіўся за 150 метраў ад вёскі. Цесць прапанаваў ісці за імі. На ўскрайку лесу, пад вывернутым вялікім дрэвам, у ямцы сядзела бабуля. Пабачыўшы нас, стала прасіць, каб яе пакінулі ў вёсцы, што ёй засталося жыць ужо зусім мала. Салдаты давялі бабулю да аўтобуса, дапамаглі ёй сесці. Гэтая гісторыя з адсяленнем у маёй памяці застанецца назаўсёды.

Разам з аўтобусам выязджала мінулае і сучаснае маіх родзічаў па жонцы, маіх новых знаёмых, проста добрых людзей. Яны пакідалі сваю малую радзіму, радасць і смутак, дзяцінства і юнацтва, свае надзеі... Яны ехалі ў невядомасць... Адно толькі адчувалі, што ўжо ніколі сюды не вернуцца, каб нармальна жыць, што развітваюцца з вёскай назаўсёды. Іх шіач, — як рэквіем на роднай зямлі, якая іх гадавала, карміла і паіла. На гэтай зямлі нарадзіліся і выраслі іх дзеці. Бывай, Лясок, бывай, мая другая радзіма, ціто падаравала мне жонку, што дала новых родзічаў, пакінула ў памяці шмат добрых успамінаў!

І зноў я ў Пагонным. Работа па адсяленні жыхароў і ліквідацыі гаспадаркі падыходзіла ўжо да канца. На плошчы, каля канторы саўгаса і далей па цэнтральнай вуліцы стаялй аўтобусы. Шмат аўтобусаў... Усё было гатова да эвакуацыі людзей.

З дырэктарам саўгаса Пятром Краўчанкам і сакратаром парткама Мікалаем Бельчанкам прайшлі яшчэ раз па вытворчых аб'ектах, паглядзелі, ці ўсё зачынена і апячатана. Падышлі да магазіна, дзе сабралася шмат вяскоўцаў. Зноў пасыпаліся пытанні: як жыць далей, ці небяспечна гэта, ці надоўга выязджаюць, што будзе з маёмасню?

Як мог і ведаў растлумачыў ім сітуацыю. Пажылыя людзі гаварылі, што так не было нават у гады Вялікай Айчыннай вайны, каб нельга было з сабой нешта ўзяць з нажытага.

Па вуліцах вёскі ўвесь гэты час хадзілі салдаты, апранутыя ў ахоўныя касцюмы. І не па сабе станавілася ад усяго гэтага.

Было спякотна. З дырэктарам саўгаса прайшлі да паганянскага канала. Недалёка ад моста вырашылі пакупацца. Вада халаднаватая, але стомленасць як рукой зняло. Тое купанне — прыклад таго, наколькі недасведчаныя былі мы пра радыеакгыўную забруджанасць, яе ўздзеянне на здароўе.

Вярнуліся ў вёску. У канторы саўгаса вадзіцелі мне сказалі, што ўсё гатова да ад'езду. Можна вывозіць людзей. Абмеркаваўшы яшчэ раз некаторыя моманты, прымаем рашэнне аб пасадцы людзей у аўтобусы. Зараз не памятаю дакладны час пачатку эвакуацыі жыхароў вёскі Пагоннае, але помню той плач, крыкі, якія стаялі над вёскай. Людзі абдымаліся і развітваліся адзін з адным. хаця пакуль яны ехалі разам. Праз некалькі месяцаў многія жыхары Пагоннага і Ляска атрымалі жыллё ў вёсцы Кірава Жлобінскага раёна, дзе жывуць і цяпер.

А тады пра гэта ніхто яшчэ не ведаў. Многія мужчыны да пасадкі ў аўтобус паспелі добра-такі напіцца, іх сілком садзілі ў транспарт. Запомнілася і тое, як бегалі вакол аўтобусаў сабакі, развітваючыся са сваімі гаспадарамі.

Даю каманду да адпраўкі, вадзіцелі займаюць свае месцы, націскаюць на сігналы — і калона, з плачам, уключанымі гукавымі сігналамі, у суправаджэнні дзесяткаў сабак, якія выюць, павольна выязджае з вёскі. Уся вёска Пагоннае, як населены пункт, перастала ісяваць, як і амаль паўсотні іншых у раёне.

Пётр Іванавіч Краўчанка запрасіў мяне дадому, дзе, па яго словах, жонка Ніна Іванаўна, якая працавала галоўным урачом участковай бальніцы, прыгатавала развітальны абед. Пасядзеўшы за сталом у гасцінных Краўчанкаў, падзякаваўшы гаспадыні за абед, развітаўся з імі і выехаў у Хойнікі. А ў вёсцы засталіся ў асноўным ваенныя, якія ўзялі пад ахову пакінутую людзьмі тэрыторыю.

Так, пачынаючы з 5 мая 1986 года, на тэрыторыі Хойніцкага раёна ўзніюіа 30-кіламетровая зона. Усе тыя дні, дзе б я ні быў і якімі б пытаннямі ні займаўся, неадступна праследавала адна думка: як там мая сям'я, мае дзеці, што будзе з усімі намі далей? Удзячны лёсу, што мая жонка, зразумеўшы сітуацыю і маё становішча, ніколі не ўчыняла разборак, не прад'яўляла катзтарычных патрабаванняў аб пераездзе, хаця падобныя гутаркі былі і ў нас. Асабліва пасля выезду з раёна тых або іншых добрых знаёмых. Ехалі ж вельмі многія. Ехалі хто куды, бо тады ж быў яшчэ Савецкі Саюз, лквдзі шукалі і знаходзілі сабе і жыллё, і работу.

У мяне, у Хойніках, па вуліцы Калесніка ў двухпакаёвай кватэры спыніліся жончыны бацькі, іншыя родзічы з адселеных вёсак. Усім хапіла месца! Калі прыязджаў вечарам дадому, дапазна з мужчынамі абмяркоўвалі сітуацыю, якая склалася, будавалі планы на будучае.

А жыццё ў райцэнтры і населеных пунктах, якія засталіся, працягвалася. Праўда, усё несла на сабе чарнобыльскі адбітак. У магазіны, калгасы і саўгасы, у арганізацыі і на прадпрыемствы завозіліся прадукты харчавання з чыстых рэгіёнаў, усім выплачвалася двайная зарплата. Выплачваліся і грошы на пакупку новага адзення пасля наведвання зоны эвакуацыі. У магазінах было шмат чырвоных він, асабліва папулярным стала «Кабэрне». Некалькі яго бутэлек было ў мяне ў сейфе ў кабінеце: медыкі раілі яго піць у невялікіх дозах.

У раён зачасцілі брыгады медыцынскіх работнікаў з Мінска, Ленінграда, іншых месц — для абследавання насельніцтва. Адзін з такіх пунктаў быў разгорнуты проста ў памяшканні райкама партыі, здаецца, медыкі з Ленінградскай ваенна-медыцынскай акадэміі. Нас правяралі, нас вывучалі... Абследаванні многіх выяўлялі вялікія ступені накаплення радыенуклідаў. Людзей накіроўвалі на дадатковае абследаванне і лячэнне. Мне таксама прапісалі нейкія таблеткі і мікстуры, рэкамендавалі пэўны час не выязджаць у 30-кіламетровую зону.

Частымі гасцямі ў нас сталі розныя ансамблі, творчьш калектывы. На стадыёне ў гарадскім парку перад насельніцтвам выступалі «Сябры», іншыя вядомыя зоркі эстрады як нашай рэспублікі, так і іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза.

Праводзіліся таварыскія сустрэчы хойніцкіх футбалістаў з мінскімі дынамаўцамі, футбольнымі камандамі многіх гарадоў вобласці. Прайшлі таксама спаборніцтвы па іншых відах спорту.

Хайнічане цёпла віталі артыстаў, перажывалі і «хварэлі» за сваіх спартсменаў-землякоў. Усё гэта адбывалася пад спякотнымі промнямі сонца, пад уздзеяннем радыеактыўнага апраменьвання.

6 мая ў «вярхах» было прынята рашэнне аб адсяленні з раёна дзяцей і цяжарных жанчын. Гэтая акцыя павінна была адбыцца 7 мая. З раніцы таго дня ў раён сталі прыбываць аўтобусы з аўтапаркаў Гомеля і іншых гарадоў вобласці. Яны размяркоўваліся па школах згодна колькасці вучняў, дашкольнікі вывозіліся разам з маці. З сельскай мясцовасці аўтобусы павінны былі прыбыць у горад недзе к 10 гадзінам, выстройваліся па дарозе Хойнікі — Гомель.

У горадзе рабілася нешта неверагоднае. Усе знаходзіліся ў стане афекта, абстаноўка была непрадказальнай. А недзе к 9 гадзінам раніцы стала вядома, што магчымы выбух на атамнай станцыі: з-за верагоднага пранікнення ў прыпяцкія воды з-пад рэактарных памяшканняў расплаўленай масы. Аб гэтым кіраўніцтва раёна было папярэджана афіцыйна. І ўсе нашы клопаты (маю на ўвазе мужчын) былі пра тое, кааб як хутчэй з Хойнік вывезці дзяцей і жонак. Аб сабе тады не думалася.

А 10 гадзіне з дазволу першага сакратара райкама партыі (быў рабочы дзень) я паехаў да СШ № 3 развітацца з жонкай і дзецьмі. Каля школы стаяла шмат аўтобусаў, пасадка дзяцей пачалася ўжо. Жонка са сваім класам была каля аўтобуса. Вакол сабраліся бацькі і родзічы ад'язджаючых. Тут я ўпершыню ўбачыў, як плачуць мужчыны. Ніхто не саромеўся слёз. Такі ж стан быў і ў мяне, не дай Божа каму яшчэ перажыць што-небудзь падобнае, што выпала ў тыя майскія дні нам.

Нарэшце пасадка закончана. Прымаецца рашэнне аб пачатку руху. Калона ў суправаджэнні машын дзяржаўтаінспекцыі і «хуткай дапамогі» з уключанымі гукавымі сігналамі рушыла.

Некаторы час праважатыя ішлі за ёй. Крыкі і плач чуліся і з аўтобусаў, і ад праважатых.

Прайшло з таго дня нямала год, а і сёння памятаюцца да падрабязнасцей тыя хвіліны, і бачу, як з аўтобуса мне махаюць рукамі сын і дачка, як плачуць яны і жонка.

Для мяне і многіх іншых мужчын раёна на доўгія месяцы пачалося халасцяцкае жыццё.

Правёўшы калону, вярнуўся ў райкам. Усе сакратары і загадчыкі аддзелаў былі на сваіх месцах, чакалі далейшага развіцця падзей на атамнай станцыі: новага выбуху. Проста сядзелі і чакалі, бо прадпрыняць што-небудзь для яго прадухілення ні мы, ні хто іншы не мог. Памятаю, зайшоў у кабінет першага сакратара, а ён сядзіць у цёмных акулярах і моўчкі глядзіць у акно. Ужо наколькі ён быў у нас дзелавым, а ў той сітуацыі таксама аказаўся бяссільны.

Час ішоў, мы сядзелі і чакалі, думалі аб тым, што хоць своечасова выехалі жонкі і дзеці. Выпіўшы крыху «Кабэрне», я выйшаў з кабінета на вуліцу. Абсалютна ніякага руху, ніякага жыцця, ні пешаходаў, ні транспарту. Вярнуўся ў памяшканне, зайшоў у кабінет Сяргея Чубка, які працаваў тады старшынёй парткамісіі. Вельмі душэўны і чулы чалавек. Перакінуліся некалькімі фразамі, якія нічога не значылі. Для сур'ёзшй размовы не было ні жадання, ні настрою. У сваім кабінеце, памятаю, узяў пачытаць нейкую газету. Мінут праз дзесяць зазваніў тэлефон. Сакратар райкама Валерый Пінчук папрасіў зайсці да яго. Падняўся на другі паверх, пабылі некаторы час у кабінеце Пінчука, а затым удвух зайшлі да першага сакратара. Запрасіўшы нас прысесці, ён запытаў аб настроі (думаю, гэта было дзяжурнае пытанне). Потым пагаварылі пра бягучыя спра-вы, падрыхтоўку да чарговага пасяджэння бюро райкама КПБ. Аб чакаемым на ЧАЭС выбуху з нас ніхто не ўспомніў.

У гэты ж час, а было каля апоўдня, пазваніў старшыня райвыканкама Аляксандр Іванавіч Абухаў. Ён паведаміў, што мяркуемага выбуху на станцыі не будзе, удалося сітуацыю ўзяць пад кантроль. Такую інфармацыю старшыня райвыканкама атрымаў, па-мойму, з Мінска.

Мы абняліся, усе былі рады таму, што ўсё так закончылася.

Гэтая вестка хутка разнеслася па юрадзе. З акон мы бачылі, як людзі на вуліцы абдымаліся, радаваліся сустрэчы адзін з адным. Хайнічане перажылі яшчэ адну стрэсавую сітуацыю. А колькі Іх яшчэ было наперадзе!

Усе гэтыя дні, пачынаючы з эвакуацыі насельніцтва і ліквідацыі гаспадарак. у раёне працаваў надзвычайны штаб па каардынацыі і правядзенні ўсіх работ, выкліканых катастрофай на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Намеснік старшыні Савета Міністраў, кіраўнікі і прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў пастаянна знаходзіліся ў Хойніках, непасрэдна тут прымалі неабходныя рашэнні.

Асаблівых слоў падзякі заслугоўвае былы старшыня Гомельскага аблвыканкама, ужо нябожчык, Аляксандр Адамавіч Грахоўскі, які кіраваў работай штаба. Менавіта дзякуючы яго арганізатарскім здольнасцям, смеласці прымаць нестандартныя рашэнні на належным узроўні вырашаліся першачарговыя задачы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на ЧАЭС.

Мы, партыйныя і савецкія работнікі раёна 1986 года, і сёння з асаблівай цеплынёй успамінаем гэтага чалавека, яго ўменне арганізаваць работу ў экстрэмальных умовах, чалавечнасць і ўвагу да людзей, паважлівыя адносіны да падначаленых.

На жаль, былі і іншыя прыклады паводзін вялікіх чыноўнікаў. Ашчаслівіў наш раён сваім прыездам і першы сакратар ЦК КПБ. Пасядзеў у кабінеце першага сакратара райкама, сустрэўся з вузкім колам зсоб. А ў гэты час у рэстаране работнікі камбіната грамадскага харчавання гатавалі для высокага госця абед, стараліся з усіх сіл: калі яшчэ давядзецца гатаваць для першай асобы дзяржавы?!

Аднак за некаторы час да абеду вяльможы ў двор рэстарана заехала спецмашына, і хлопцы ў шэрых пінжаках сталі нешта пераносіць з яе салона ў скрынках у рэстаран. Потым з кухні і залы былі выдалены нашы повары і афіцыянткі.

Аказалася, што для яго з Мінска былі прывезены прадукты харчавання, лыжкі і відэльцы, іншы посуд. Нават повары і афіцыянткі. Рукі перад ядой ён таксама мыў сталічнай вадой.

Ва ўстаноўлены час разам са сваёй світай пад'ехаў да рэстарана, падняліся наверх, там і адабедалі са сталічных

прадуктаў. А ў гэты час перад рэстаранам сталі збірацца перасяленцы, жыхары горада. Народ хацеў сустрэцца з кіраўніком рэспублікі, паслухаць яго, задаць пытанні. Думаю, гэта было цалкам нармальнае жаданне.

Начальнік раённай міліцыі падпалкоўнік Леанід Жаўняк далажыў першаму сакратару райкама, што на вуліцы сабраліся людзі. Безумоўна ж, ні аб якой сустрэчы, аб выхадзе да іх высокага чыноўніка не магло быць і размовы: вялікіх ліодзей трэба берагчы, навошта ім «рваць» свае нервы, у іх і так праблем хапае. Падпалкоўнік Жаўняк выйшаў на вуліцу і папрасіў натоўп разыходзіцца, паведаміўшы пры гэтым, што ніхто з імі сустракацца не будзе. Людзі зашумелі, захваляваліся...

Праз некаторы час з двара рэстарана выехалі машыны першага сакратара ЦК і суправаджаючых яго асоб і ўзялі курс на Гомель. Гэты візіт запомніўся ўсім нам, і заўсёды мы аб ім успамінаем з недаўменнем і прыкрасцю.

А ў раёне працягвалася жыццё. Яно несла на сабе трагічны адбітак Чарнобыля. Даводзілася вырашаць пытанні, пра якія раней не маглі нават думаць: размяшчэнне адселеных жыхароў, іх працаўладкаванне, выплата грашовых сродкаў як кампенсацыю за пакінутую маёмасць, забеспячэнне насельніцтва «чыстымі» прадуктамі харчавання, арганізацыяй медыцынскага абслугоўвання хайнічан і шэраг іншых. Вяскоўцы ў гаспадарках, якія засталіся, па-ранейшаму сеялі, нарыхтоўвалі кармы, даглядалі жывёлу. Працавалі прадпрыемствы і арганізацыі горада. Кожную суботу досвіткам з Хойнік у бок Гомеля і Калінкавіч цягнулася чарада легкавых аўтамашын. Гэта жыхары раёна, у асноўным мужчыны, ехалі ў піянерскія лагеры, санаторыі, дамы адпачынку, каб наведаць сваіх жонак і дзяцей, якія знаходзіліся там на аздараўленні. А насустрач ішла тэхніка з будаўнічымі матэрыяламі, абсталяваннем і канструкцыямі: узводзіўся сёння ўжо нікому не патрэбны пункт дэзакгывацыі ў Берасцечку і іншыя аб'екты.

А потым быў другі этап адсялення восенню 1986 года. Праз некалькі год разам з іншымі быў адселены і мой родны пасёлак імя Леніна. Бацькі атрымалі жыллё ў горадзе Гомелі. Першы час я часта заязджаў на сваю малую радзіму, наведваў бацькоўскі дом, хадзіў па садзе і агародзе, па вуліцы. Кожная такая паездка болем адгуквалася ў сэрцы, цяжка і сумна было глядзець, як тое, што акружала многія гады, прыходзіць у залусценне. Буйная зеляніна вясной і летам, цвіценне садоў у маі напамінае і сёння пра той далёкі час, калі тут жылі людзі, што тут нарадзіўся і вырас, крочыў у першы клас пачатковай школы, адсюль пайшоў у вялікае жыццё.

Мае аднавяскоўцы раз'ехаліся пасля адсялення па ўсёй Беларусі і дален. Толькі светлая памяць засталася пра іх!

Памяць, памяць, пзмяць... Добра, што ў чалавека ёсць яна, што ён здольны помніць. Памяць непадуладна гадам, проста асобныя падзеі і факты мшулага жыцця адсоўваюцца на задні план днём сённяшнім, яго праблемамі, смуткам і радасцямі.

Катастрофа на Чарнобыльскай атамнай станцыі, якая здарылася 24 гады таму, выклікала праблемы, вырашэнне якіх будзе працягвацца многія дзесяцігоддзі. А тыя першыя меры, першыя дзеянні па ліквідацыі атамнага следу з гадамі забудуцца, сатруцца з памяці, як пойдуць у свет іншы відавочцы і непасрздныя ўдзельнікі тых далёкіх падзей. Іх дзеянні і прынятыя рашэнні застануцца толькі ва ўспамінах, пакладзеных на паперу, і ў сухіх тэкстах прынятых тады загадаў, рашэнняў і пастаноў.

У сваіх успамінах я спыніўся толькі на першых тыднях нашай работы ва ўмовах катастрофы, першых кроках па ліквідацыі вынікаў аварыі, на сваіх улас-ных думках і перажываннях, не спасылаючыся пры гэтым ні на адзін афіцыйны дакумент або заяву, выказванне.

А наперадзе былі і будуць яшчэ дні, месяцы і гады працы і жыцця пад Чарнобылем...

В.Баранаў

Источник: Полымя.-2010.-№ 4.-С.15-165.